# Год пад сцягам Саветаў

Н. Я. НАТАЛЕВІЧ

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР

Год назад наша гераічная Чырвоная Армія працягнула брацкую руку дапамогі і вызваліла ад ярма польскіх памешчыкаў і капіталістаў народы Заходняй Беларусі, ажыццявіўшы іх многагадовыя чаянні. Выражаючы аднадушную волю мас, Народнае Сабранне абвясціла ўстанаўленне Савецкай улады. Брацкія народы назаўсёды аб'едналіся ў адзінай сям'і народаў СССР.

Заходняя Беларусь, вызваленая ад сацыяльнага, нацыянальнага, эканамічнага і палітычнага прыгнёту, вырвалася з ціскоў жабрацтва, беспрацоўя і голада і выйшла на шырокую дарогу свабоднага і радаснага жыцця.

Прайшоў усяго толькі адзін год, а якія адбыліся велізарныя змены! Прадукцыйныя сілы, раней скаваныя капіталістычнымі ланцугамі, атрымалі магчымасць свабоднага развіцця. Мільёны працаўнікоў далучыліся да грамадскага, палітычнага і культурнага жыцця і развіваюць каласальную творчую работу. Культура і мастацтва, растаптаныя ботам польскіх паноў, адроджаны і атрымалі ўмовы для поўнага свайго росквіту.

Неймаверны прыгнёт у былой панскай Польшчы адчулі на сабе нацыянальныя меншасці. У падаўленні іх правоў, у здзеках над імі правячая кліка Польшчы пераўзышла нават царскіх сатрапаў. Асабліва жорстка прыгняталася беларускае, яўрэйскае, украінскае насельніцтва. Пускаліся ў ход усе сродкі: паланізацыя, праследаванне роднай мовы, закрыццё школ і другіх культурных устаноў, карныя экспедыцыі, арышты, турмы, пагромы і расстрэлы.

Толькі пад сцягам Саветаў працоўныя ўсіх нацыянальнасцей атрымалі доўгачаканую свабоду і палітычныя правы. Упершыню ў сваёй гісторыі яны атрымалі магчымасць, як роўныя сярод роўных, на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі выбіраць сваіх прадстаўнікоў у вярхоўныя органы ўлады сацыялістычнай дзяржавы.

Выбары ў Вярхоўныя Саветы СССР і БССР прайшлі пад знакам велізарнай палітычнай і творчай актыўнасці найшырэйшых мас насельніцтва. Працоўныя заходніх абласцей аднадушна галасавалі за верных сыноў і дачок народа. Сярод выбраных імі дэпутатаў Вярхоўных Саветаў — былы батрак, палкі рэвалюцыянер Сергей Осіпавіч Прытыцкі, былая батрачка Зоя Канстанцінаўна Скобля, народны настаўнік Антон Семёнавіч Малевіч, інжынер Іван Антонавіч Турлейскі, тэкстыльшчыца Марыя Канстанцінаўна Петроўская.

А хто былі дэпутаты былога польскага сейма? Буйныя землеўласнікі, вышэйшыя дзяржаўныя чыноўнікі, адвакаты, бургамістры, чыны паліцыі. Рашаць лёс краіны мелі права толькі памешчыкі і капіталісты, людзі, маючыя салідныя капіталы.

Толькі па Сталінскай Канстытуцыі народ атрымаў магчымасць выбіраць сваіх сапраўдных прадстаўнікоў. Сярод дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР ад заходніх абласцей: рабочых — 61 чалавек (30 проц.), сялян — 90 чалавек (45 проц), інтэлігенцыі — 51 чалавек (25 проц.). Па нацыянальнаму саставу: беларусаў — 136, рускіх — 33, украінцаў — 4, яўрэяў — 12, палякаў — 15, грузін, — 1, літоўцаў — 1.

Працоўныя заходніх абласцей відавочна ўбачылі, што Савецкая ўлада цвёрда праводзіць у жыццё рашэнні Народнага Сабрання і што яна з'яўляецца сапраўды народнай уладаю. Яны на справе даведаліся, якія шырачайшыя магчымасці адкрывае перад імі сацыялістычны лад.

Сотні тысяч беззямельных і малазямельных сялянскіх гаспадарак надзелены зямлёй, раней належаўшай польскім памешчыкам і магнатам. Звыш 25 тысяч бескароўных і 10 тысяч бясконных гаспадарак атрымалі кароў і коней. У дапамогу сялянам Савецкая ўлада накіравала аграномаў, тэхнікаў, інжынераў. Створана 101 МТС. У заходне-беларускай вёсцы, дзе раней рэдка бачылі самую прымітыўную металічную прыладу, будуюцца машынна-трактарныя майстэрні, 14 гаражоў, 15 кузняў. Пры МТС вырастаюць жылыя пасёлкі з добра абсталяванымі дамамі, клубамі, лазнямі.

На вызваленай зямлі сяляне паспяхова правялі першую бальшавіцкую вясну і сабралі багаты ўраджай. Больш 29,3 тыс. аднаасобных сялянскіх гаспадарак аб'ядналіся ў калгасы. Найбольш перадавыя сяляне, беднякі і серадкякі, навучаючыся на прыкладзе вялікага Савецкага Саюза, выступаюць ініцыятарамі арганізацыі калгасаў і ствараюць іх.

Усюды цяпер кіпіць напружаная творчая праца будаўнікоў новага, сацыялістычнага жыцця.

Беспрацоўе было неадлучным спадарожнікам жыцця працоўных панскай Польшчы. Беспрацоўных у Заходняй Беларусі было па колькасці нават больш, чым працуючых. Значная колькасць занятых працай працавала няпоўны тыдзень. Зараз усё гэта ўшло ў безваротнае мінулае. Ужо з першых дзён свайго існавання савецкая ўлада ў заходніх абласцях моцна ўзялася за ліквідацыю беспрацоўя. Хуткая рэканструкцыя народнай гаспадаркі на новай, сацыялістычнай аснове абумовіла беспрыкладны рост колькасці рабочых і служачых ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Цяпер з беспрацоўем—гэтай цяжкай спадчынай капіталізма — пакончана.

Упершыню заходнія вобласці БССР маюць у гэтым годзе свой бюджэт, які складае амаль 730 мільёнаў рублёў. З іх 400 млн. руб. адпушчана на сацыяльна-культурныя мерапрыемствы.



Камсамолец-двухстаночнік 1-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната **Г. А. Ціноцкі**, які выконвае норму на 110 проц. і выпускае прадукцыю добрай якасці.

Фото І. Рабіновіча.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы